**УДК 1(091)(476)"17"**

# РЭФОРМА АДУКАЦЫІ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ XVIII СТАГОДДЗЯ

***Я.В. ТАРАСЮК***
***(Інстытут філасофіі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуецца гісторыя філасофскай і педагагічнай думкі Рэчы Паспалітай эпохі Асветніцтва. Разглядаецца праграма Collegium Nobilium, распрацаваная Станіславам Канарскім у супрацьвагу традыцыйнай езуіцкай адукацыі. Далей аналізуецца праект Антонія Паплаўскага, які стаў падставай праведзенай Адукацыйнай камісіяй рэформы сістэмы адукацыі Рэчы Паспалітай. Дадзены праект прадугледжваў увядзенне пачатковай адукацыі для сялян. Паказана, што ў якасці канцэптуальнай асновы змен у адукацыі выступала фізіякратычная дактрына, папулярная сярод філосафаў Рэчы Паспалітай эпохі Асветніцтва. Прыняцце ідэй фізіякратызму прывяло да ўвядзення ў вучэбныя курсы тэорыі натуральнага права і палітычнай эканоміі і замены імі традыцыйнага курса філасофіі. У выніку праведзеных у XVIII стагоддзі рэформ адукацыя атрымала свецкі характар і была арыентавана на фарміраванне грамадскіх дабрачыннасцяў.*

Культура эпохі Асветніцтва паставіла перад соцыумам вельмі важнае пытанне: якім чынам зрабіць грамадства разумным. Асветнікі звярнулі сваю ўвагу на адукацыю і выхаванне як на адны з самых уплывовых сродкаў уздзеяння на чалавека. Што павінна складаць падставовыя веды і якім чынам іх перадаць? – вось галоўнае пытанне, якое вырашалася філосафамі Рэчы Паспалітай часоў Асветніцтва на дзяржаўным узроўні. Новая адукацыйная сістэма стала вынікам пералому ў светапоглядзе грамадства, які адбыўся ў XVIII стагоддзі пад уплывам шматлікіх фактараў. Гэты працэс станаўлення асветніцкай філасофіі мае багатую традыцыю вывучэння. Вялікая колькасць прац, прысвечаных дадзенай праблеме, належыць польскім навукоўцам. Сярод іх варта ўзгадаць такіх даследчыкаў, як С. Тынц [1], К. Бартніцкая [2] і інш., якія закраналі пытанні, што датычыліся дзейнасці Адукацыйнай камісіі. У іх працах таксама змяшчаецца аналіз этычных і педагагічных уяўленняў асветнікаў. Ідэі Асветніцтва ў Рэчы Паспалітай знаходзіліся і ў цэнтры ўвагі беларускіх гісторыкаў філасофіі. У працах Э. Дарашэвіча [3], У. Дуброўскага [4], У. Цукермана [5], І. Бабкова [6] даецца аналіз асноўных напрамкаў развіцця асветніцкай філасофіі. Тым не менш адукацыйная тэматыка, якая актыўна распрацоўвалася асветнікамі, не знайшла тут належнага асвятлення.

**Асноўная частка.** Галоўнае пытанне, якое паўстае перад намі, наступнае: што змянілася ў адукацыйнай сістэме Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі і якім чынам гэта адбылося? Пачынаючы з XVI стагоддзя ўніверсітэты і калегіумы былі галоўнымі адукацыйнымі цэнтрамі Рэчы Паспалітай. Выкладанне ў іх адбывалася па сістэме, распрацаванай езуітамі. У 1599 годзе была прынятая праграма Ratio Studiorum, інспіраваная заснавальнікам Таварыства Ісуса Ігнацыям Лайолам. Гэтая праграма рэгламентавала спосаб навучання ва ўсіх езуіцкіх навучальных установах. Фактычна, гэта была спроба ўніфікаваць сістэму адукацыі, падпарадкаваць яе пэўным мэтам. Як адзначаюць даследчыкі, адукацыйная сістэма езуітаў была для свайго часу вельмі эфектыўнай, а што датычыцца зямель Рэчы Паспалітай, то тут яна стала галоўным фактарам фарміравання ўласнай прафесійнай інтэлектуальнай школы. Але ў XVIII стагоддзі езуіцкая сістэма адукацыі шмат у чым перастала адпавядаць запытам з боку найбольш прагрэсіўнай часткі грамадства. Сярод прадстаўнікоў інтэлектуальнай эліты пачаліся пошукі новых варыянтаў арганізацыі навучання.

Найбольш значнай у гэтым напрамку стала дзейнасць Станіслава Канарскага (1700 − 1795), які належаў да ордэна піяраў. На землях Рэчы Паспалітай піяры з'явіліся ў 1642 годзе, але росквіт іх дзейнасці адносіцца да XVIII стагоддзя. Менавіта з піярамі многія даследчыкі звязваюць пачатак зменаў у адукацыі і навуцы. Станіслаў Канарскі, атрымаўшы адукацыю ў польскіх піярскіх школах, а пасля ў Collegium Nazareum у Рыме, па вяртанні ў Рэч Паспалітую заснаваў Collegium Nobilium у Варшаве (1740). У межах дадзенай навучальнай установы была распрацавана прынцыпова новая на той час адукацыйная праграма. Пры гэтым, аднак, падкрэслівалася тое, што навучанне павінна адбывацца ў адпаведнасці з патрабаваннямі хрысціянскай рэлігіі.

Праграма Collegium Nobilium была сфармулявана С. Канарскім у «Школьных уставах» [7]. Навучанне ў калегіуме прадугледжвала пяць класаў, што адпавядала сямі гадам. Ніжэйшая ступень – класы «парва» і «інфіма», у якіх выкладаліся пачаткі граматыкі і чытання на лаціне, біблійная гісторыя. У класе «граматыкі» вывучаліся польская гісторыя і пачаткі матэматыкі. У класе «сінтакса» прапаноўвалася асобную частку заняткаў прысвяціць вывучэнню значных гістарычных падзей, што павінна было прывесці да разумення прычын сацыяльных і палітычных канфліктаў. Класы «гуманістыкі» і «рыторыкі» былі накіраваны на ўдасканаленне здольнасцей вучняў у красамоўстве і аргументацыі. У «Школьных уставах» С. Канарскі падкрэслівае, што неабходна пазбягаць тых момантаў, якія могуць ілюстраваць супярэчнасць паміж свабодай і каралеўскай уладай. Забароненымі тэмамі былі пытанні, якія датычылі праблем liberum veto, выбарнасці і спадчыннасці трону. Асобны раздзел у «Школьных уставах» быў прысвечаны выкладанню філасофіі. Станіслаў Канарскі, адзначаючы, што філасофія з'яўляецца свабоднай навукай, а таму ўтрымлівае ў сабе разважанні, якія могуць супярэчыць рэлігіі, падкрэслівае неабходнасць выкладаць фі-

ласофію ў адпаведнасці з праграмай, па якой яе вывучаюць у Рыме. Навучанне логіцы вялося на падставе кніг Ф. Бэкана, Р. Лулія, П. Гасэндзі, Р. Дэкарта, Х. Вольфа, Д. Лока і іншых прадстаўнікоў заходнееўрапейскай філасофіі; метафізіка выкладалася па сістэме Х. Вольфа, якая ўключала ў сябе анталогію, касмалогію, псіхалогію і натуральную тэалогію. Да гэтага таксама дадавалася вывучэнне этыкі (агульнай і спецыяльнай), матэматыкі і фізікі. Курс тэалогіі прадугледжваў засваенне асноў каталіцкай веры.

Праграма Collegium Nobilium стала падставай для рэформы піярскіх школ, паспрыяла станаўленню новага пакалення інтэлектуалаў у Рэчы Паспалітай. Асноўная мэта С. Канарскага заключалася ў тым, каб праз правільна распрацаваную сістэму навучання сфарміраваць новы тып шляхты, здольнай да пераглядy старых стэрэатыпаў. У сваёй праграме С. Канарскі вызначае спіс кніг, якія можна чытаць вучням, каб у іх былі сфарміраваныя неабходныя ўяўленні пра прынцыпы вядзення палітыкі. Дадатковае вывучэнне французскай і нямецкай моў таксама мела мэтай выхаванне свецкага чалавека, здольнага быць карысным на дзяржаўнай службе. Пытанні, да якіх звяртаецца С. Канарскі ў сваіх творах, былі прынцыповымі і неаднаразова да іх звярталіся розныя мысліцелі. Collegium Nobilium, заснаваны С. Канарскім, з'яўляўся навучальнай установай, прызначанай для эліты Рэчы Паспалітай – заможнай шляхты. Навучэнцы калегіума павінны былі стаць у наступным палітычнымі дзеячамі, таму выхаванне было скіравана на культывацыю патрыятычных пачуццяў і ўсведамлення адказнасці за будучыню краіны. Але гэтага было ўжо недастаткова ў тых складаных сацыяльных і палітычных умовах, у якіх апынулася Рэч Паспалітая ў другой палове XVIII стагоддзя. Зварот да вучэння французскіх фізіякратаў і актыўнае супрацоўніцтва з імі прывялі да ўзнікнення пэўных сантыментаў адносна ніжэйшых станаў грамадства, на якія таксама павінна была распаўсюдзіцца асвета.

Мэтай створанай Адукацыйнай камісіі стала рэформа школьнай сістэмы Рэчы Паспалітай. Камісія дзейнічала ў перыяд з 1773 па 1794 год; яе галоўнымі дзеячамі былі Ігнацый Масальскі, Адам Чартарыйскі, Іахім Храптовіч і іншыя – прадстаўнікі рэфарматарскага кола, прыхільнікі караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Іх дзейнасць таксама была скіраваная на тое, каб сфармаваць сярод шляхты іншае стаўленне да краіны, да асобы караля і пераадолець кансерватызм у адносінах да новых навуковых ведаў. Ломка старога светапогляду – цяжкі і доўгі працэс, які патрабаваў ад рэфарматараў уздзеяння на меркаванні не толькі моладзі, якая павінна была атрымліваць адукацыю, але і на выкладчыкаў. Выкладчыкамі ж былі пераважна былыя езуіты, у той час як сама Адукацыйная Камісія – праект цалкам свецкі. Яе арганізатары стварылі адукацыйную сістэму, якая б задавальняла не царкоўныя, а дзяржаўныя патрэбы, была падпарадкавана выключна інтарэсам Рэчы Паспалітай.

На разгляд Камісіі было прадстаўлена некалькі праектаў адукацыйнай рэформы, але найбольшую цікавасць атрымаў праект Антонія Паплаўскага, выдадзены ў 1775 годзе пад назвай «Аб пастанове і ўдасканаленні грамадскай адукацыі». Ён і стаў падставай праведзеных рэформ адукацыі. Галоўнае, на чым робіць акцэнт А. Паплаўскі, – гэта роля адукацыі ў фарміраванні грамадзяніна. Разглядаючы сучасную яму грамадска-палітычную сітуацыю, ён канстатуе, што пры немагчымасці змяніць дарослае пакаленне, неабходна зрабіць усё магчымае, каб выхаваць будучае пакаленне такім чынам, каб яно адпавядала мэтам і патрэбам грамадства. У пачатку твора А. Паплаўскі выразна падкрэслівае, дзве рэчы: па-першае, адзін з чаканых вынікаў рэформы – гэта лаяльнасць да каралеўскай улады праз разуменне таго, што ёсць асновай дабрабыту любога грамадства; па-другое, А. Паплаўскі ўводзіць ідэю падпарадкаванасці людзей натуральнаму парадку: «Найвялікшае шчасце для іх у грамадскім і палітычным жыцці палягае на тым, каб трымаліся зямнога парадку і натуральных законаў, якія вынікаюць з яго і якія Бог нязменна вызначыў для іх з немінучым пакараннем і ўзнагародай» [8, s. 7 – 8]. Гэты тэзіс адпавядае фізіякратычнай дактрыне, прыхільнікам якой быў А. Паплаўскі. Гэтая прыхільнасць да фізіякратызму, як пабачым далей, знайшла сваё адлюстраванне і ў пытаннях, датычных адукацыі і выхавання.

На пачатку свайго твора А. Паплаўскі разглядае, што такое адукацыя ўвогуле. Адказ на гэтае пытанне вынікае з разумення таго, «чым ёсць дзіця, што ў дзіцяці – чалавек, што ў гэтым чалавеку – суграмадзянін паводле ўкладу прыроды» [8, s. 12]. Чалавек складаецца з душы і цела, якія маюць як свае асаблівасці функцыянавання, так і агульныя патрэбы, уласцівыя прыродзе разумнага і свабоднага стварэння. Асаблівасць прыроды чалавека заключаецца ў пастаянным пошуку шчасця, якое магчыма толькі пры належным выкарыстанні сіл душы і цела і пры ўмове супольнага існавання з іншымі людзьмі. Чалавек пэўны час жыве ў дзіцячым стане, у гэты час і пачынаецца яго выхаванне. Паплаўскі вылучае тры віды адукацыі: першая – фізічная адукацыя, якая напраўлена на фарміраванне здольнасцей цела; другая – адукацыя розуму альбо інструкцыя (тэрмін «інструкцыя» даволі часта выкарыстоўваецца ў асветніцкіх тэкстах дзеля азначэння шляхоў удасканалення менавіта розуму); трэцяя – маральная адукацыя, якая фарміруе звычкі і ўчынкі чалавека, неабходныя для жыцця ў грамадстве і дзеля грамадства.

Адносна пануючай на той час фізічнай адукацыі А. Паплаўскі выказвае думку аб неабходнасці развіцця разумовых здольнасцей чалавека, такіх як свабода выбіраць і рабіць высновы: «Самымі лепшымі і значнымі часткамі навукі будуць рэфлексія, назіранне і развагі ўласнага розуму, чым чужыя погляды, школа альбо кніга» [8, s. 18]. Правільна сфарміраваныя фізічныя і разумовыя здольнасці чалавека – аснова для маральнага ўдасканалення. Мэта маральнай адукацыі – фарміраванне ўяўлення аб тым, на чым грунтуецца шчасце чалавека. Паплаўскі даводзіць, што шчасце залежыць ад дабрадзейнасцяў, якія ў сваю чаргу залежаць ад натуральных законаў. Сярод асноўных дабрадзейнасцяў ён вылучае спра-

вядлівасць як найбольш важную для грамадства. Ідэя справядлівасці звязаная з пытаннем пра правы і абавязкі чалавека – адным з цэнтральных пытанняў сацыяльна-палітычнай думкі Асветніцтва. Паводле А. Паплаўскага, клопат пра ўласныя інтарэсы – гэта натуральнае імкненне чалавека. Але яно павінна ўзгадняцца з уяўленнем аб справядлівасці і з натуральнымі законамі. Гэтыя ідэі павінны быць у маленстве засвоеныя на практыцы. Менавіта праз працу, лічыць А. Паплаўскі, чалавек здольны ўсвядоміць натуральны парадак, закладзены Богам: праца ёсць платай за ўласныя правы.

Пазіцыя А. Паплаўскага, накіраваная на тое, каб давесці да чытача сувязь, якая ўзнікае паміж палітычным жыццём грамадства і асобным чалавекам. Менавіта публічнае асяроддзе ўплывае на тое, што чалавек можа лічыць прымальным і абраць у якасці прыкладу паводзінаў. Выразна ілюструе гэтую думку наступная цытата: «Добрая маральная адукацыя і дадзеная праз яе навука грамадскага жыцця, добрыя вынікі з іх абедзвюх у жыцці чалавека (…) залежаць ад ураду краіны, які кіруе справамі грамадзян, ад яго палітыкі, якая па сваёй сутнасці з’яўляецца пануючай маральнай навукай усяго народа» [8, s. 42]. Менавіта ўлада, калі працягнуць думку А. Паплаўскага, павінна забяспечыць веданне ўсімі грамадзянамі іх правоў і абавязкаў, а для гэтага самі правы і абавязкі павінны быць адпаведна і дакладна вызначанамі.

Трэба адзначыць, што А. Паплаўскі ў асноўным аддае перавагу развіццю адукацыі, якая фактычна будзе мець свецкі характар. Хаця пры гэтым піша ён ад імя ордэна піяраў. Ён не абмінае ўвагай неабходнасць хрысціянскага навучання, але відавочна, што яно ў рэфармаванай школе павінна займаць другаснае месца ў якасці дадатку да маральнай адукацыі, накіраванага на самаўдасканаленне. З тэзісаў А. Паплаўскага вынікае, што маральная навука, прачытаная праз фізіякратызм, дастатковая для грамадства. Гэтая прыхільнасць да фізіякратызму мела свае сур’ёзныя наступствы для адукацыйнай сістэмы Рэчы Паспалітай. Пэўная частка праекта А. Паплаўскага прысвечана тым навукам, якія павінны выкладацца ў школах і ўніверсітэтах. Парадак іх ён вызначае наступны: натуральная філасофія, геаграфія, фізіка, логіка, маральная навука, геаметрыя, натуральнае права, польская мова, рыторыка, гісторыя. У гэтым пераліку не знайшлося месца філасофіі. Паплаўскі абгрунтоўвае такую пазіцыю наступным чынам: «Няма філасофскай этыкі, затое ёсць цэлая маральная навука, у якой разглядаюцца справы, а не памкненні, дабрадзейнасці з карысцю, злачынства са шкодай звязаныя, а не дабрадзейнасць дзеля самой дабрадзейнасці. Няма асобнай метафізікі, але затое ёсць метафізіка арыфметыкі ў асобных яе правілах, метафізіка геаметрыі (…), ёсць патрэбная метафізіка чалавечай мовы альбо логіка, якая ідзе пасля граматыкі, метафізіка прамовы ў правілах рыторыкі і паэтыкі» [8, s. 94].

Практычнае навучанне становіцца на першае месца, паколькі, па-першае, дазваляе хутчэй засвоіць атрыманыя веды, па-другое (і гэта галоўнае), патрэбнае менавіта самому грамадству, якое ў выніку такога падыходу атрымае людзей, падрыхтаваных да вядзення гаспадаркі. Таму не дзіўна, што А. Паплаўскі прапануе ўвесці ў школе для класа логікі (для вучняў 14-гадовага ўзросту) вывучэнне палітычнай эканоміі разам з эканамічнай табліцай Франсуа Кенэ, з дапамогай якой «не толькі пракласці сабе дарогу да разумення натуральнага і палітычнага права, не толькі навучыцца быць добрым суграмадзянінам і сынам Айчыны (…), але відавочна пазнае з яе ўкладу, заснаванага на фізічным парадку, якія законы вызначыў Бог для людзей, вымушаных жыць у грамадстве» [8, s. 89].

Для А. Паплаўскага адукацыя – гэта адзін са сродкаў, з дапамогай якога могуць быць вырашаныя эканамічныя і сацыяльныя праблемы. Гэтым тлумачыцца і вялікая зацікаўленасць яго ў асвеце не толькі шляхты, якая перадусім павінна сфарміравацца як палітычная сіла, але і сялянства. У працы «Збор некаторых палітычных матэрый» (1774) А. Паплаўскі прысвяціў асобны раздзел пытанням адукацыі сялянства. Адкуль узнікае гэты інтарэс? Услед за А.Г. Мірабо і Ф. Кенэ ён разглядае сялянства як асноўную частку грамадства, ад якой залежыць эканоміка, і падкрэслівае наступнае: «яны людзі і нашыя суграмадзяне, яны павінны атрымліваць ад іншых і ад усяго грамадства дапамогу праз асвету розуму столькі − каб паводле сваёй меры і патрэбы быць шчаслівымі − колькі яны са свайго боку прыкладаюць да агульнага шчасця» [9, s. 124]. У развагах А. Паплаўскага важнымі з’яўляюцца дзве рэчы: па-першае, ён у сваім творы звяртаецца да разгляду не проста чалавека як такога, а як прадстаўніка пэўнага стану, носьбіта асаблівых сацыяльных функцый. Сялянства падпарадкавана таму ж самаму натуральнаму парадку, што і астатняе грамадства, і з гэтай прычыны мае права ўзаемнасці абавязкаў паміж сабой і грамадствам; па-другое, дабрабыт у грамадстве магчымы толькі пры ўмове ўсведамлення ўсімі станамі сваіх функцый. Розум выступае як інструмент, з дапамогай якога чалавек павінен удасканальваць свае здольнасці дзеля свайго і агульнага дабра. Але А. Паплаўскі таксама ўказвае на тое, што аднаго толькі прыроджанага розуму недастаткова для поспеху. «Вялікая розніца існуе паміж адпаліраваным і нявыхаваным розумам. Святло другога сягае недалёка, першага ж – на будучыя і мінулыя рэчы; гэты ўмее толькі тое, што сам ведае, той жа – што і іншыя ўмелі (…) для такога розуму, хоць трохі асвечанаму навукай, у іншай форме паўстае само земляробства, якое патрабуе столькі ведаў і ўвагі над прыроднымі рэчамі і столькі чужога і ўласнага досведу» [9, s. 131]. З пункту гледжання А. Паплаўскага, для сялянства дастаткова навучыцца чытаць, пісаць, затым асвоіць арыфметыку і асновы земляробства і медыцыны. Падручнікі, адрасаваныя сялянству, не павінны ўтрымліваць у сабе ніякіх філасофскіх развагаў, спекуляцый, а толькі звесткі, неабходныя для практычнай дзейнасці.

Адукацыйны праект А. Паплаўскага, такім чынам, меў наступныя асаблівасці: па-першае, ён выступаў як пэўны дапаможнік па пытаннях выхавання і адукацыі; па-другое, утрымліваў у сабе і новае бачанне чалавека, які разглядаўся ў першую чаргу як грамадзянін, вымушаны вырашаць свае жыццёвыя праблемы праз супрацоўніцтва з іншымі людзьмі. Чалавек павінен сфармавацца як грамадзянін, імкнуцца да набыцця

ведаў і ўменняў, якія будуць вырашаць яго зямныя патрэбы. Філасофія, якая мэтанакіроўвае чалавека на самаўдасканаленне, паглыбленне ў таямніцы свету, вырашэнне метафізічных пытанняў, стаецца ў гэтай сістэме збыткоўнай, паколькі не нясе відавочнай карысці для грамадства. Яе месца займае палітычная эканомія, якая, на думку А. Паплаўскага, сумяшчае ўсе неабходныя веды пра свет: ідэі фізічна-маральнага парадку і натуральнага закона, якія сталі своеасаблівай адзнакай «станіслаўскага» Асветніцтва.

Ідэі, прапанаваныя А. Паплаўскім, былі пакладзеныя ў аснову «Устава Камісіі па нацыянальнай адукацыі», рэдагаванай Гжэгажам Пірамовічам. Дадзены ўстаў рэгламентаваў дзейнасць саміх прадстаўнікоў Камісіі, вызначаў іерархію навучальных устаноў, прадметы, якія павінны былі вывучацца на ўсіх ступенях навучання. У першым раздзеле «Устава» агалошаны прынцып, паводле якога адукацыя павінна ажыццяўляцца пры непарушнасці свабоды чалавека і грамадзяніна. Былі арганізаваныя дзве вышэйшыя школы – Галоўная школа Літоўская (Віленская) і Галоўная школа Каронная (Кракаўская). Адпаведна з патрабаваннямі фізіякратызму – даваць толькі неабходныя, практычныя веды – выкладанне вялося па чатырох напрамках. Камісія захавала ў структуры школы тэалагічны калегіум, у якім павінны былі рыхтавацца кадры для касцёла. Асноўная ж перавага аддавалася фізічнаму, юрыдычнаму і медыцынскаму калегіумам. Мэтай школы ставілася дасягненне шчасця як асобным чалавекам, так і ўсім грамадствам («каб чалавеку было добра і каб з ім было добра»). Між тым, што праграма пастулявала роўнасць паміж усімі станамі, на практыцы адукацыя для прадстаўнікоў ніжэйшых станаў абмяжоўвалася пачатковым узроўнем (парафіяльныя школы), хаця былі і выключэнні.

**Заключэнне.** Новы падыход да адукацыі грунтаваўся на разуменні чалавека як носьбіта пэўных сацыяльных функцый. У выніку адбылася трансфармацыя традыцыйнай рэлігійна арыентаванай адукацыі. Станіслаў Канарскі яшчэ спрабуе правесці рэформы з захаваннем вернасці традыцыйным хрысціянскім каштоўнасцям і падтрыманнем статусу рэлігійнай адукацыі. Пра гэта сведчыў вельмі асцярожны выклад зместу навучання, пільны адбор ідэй, якія павінны былі засвоіць навучэнцы, каб у выніку не ўзнікла падтрымка антырэлігійных плыняў. Але паклаўшы ў падмурак сваёй праграмы перадусім ідэю грамадзяніна і служкі дзяржавы, С. Канарскі тым самым прывёў да зваротнага выніку – адмаўлення ад рэлігійнага складніка ў адукацыі. Вышэйшая адукацыя, як ужо яе разумелі асветнікі, павінна была рыхтаваць асоб вышэйшых станаў да грамадскай службы, таму яе асновай стала маральная навука, у якой націск рабіўся на вывучэнне натуральнага права і этыкі, якая мела ўтылітарныя падставы. Такім чынам, адукацыя ў Рэчы Паспалітай у выніку дзейнасці Адукацыйнай камісіі (пры ўдзеле як грамадскіх, так і царкоўных дзеячаў) стала набываць свецкі і прагматычны характар.

ЛІТАРАТУРА


1. Tync, S. Nauka moralna w szkołach KEN / S. Tync. − Kraków, 1922. – 307 s.
2. Bartnicka, K. Koncepcje wychowania obywatelskiego i patriotycznego w szkołach KEN / K. Bartnicka // Rozprawy z dziejów oświaty. Tom XVI. – Wrocław, 1973. − S. 42 – 68.
3. Дорошевич, Э.К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии / Э.К. Дорошевич. − Минск: Наука и техника, 1971. – 239 с.
4. Дубровский, В.В. Казимир Нарбут / В.В. Дубровский. − Минск: Наука и техника, 1977. – 136 с.
5. Цукерман, А.Я. Философская мысль в Белоруссии сер. XVIII в. / А.Я. Цукерман. − Минск, 1980. – 111 с.
6. Бабкоў, І.М. Філасофія Яна Снядэцкага / І.М. Бабкоў. − Мінск-Вільня: Фрагмэнты, 2002. – 135 с.
7. Konarski, S. Ustawy szkolne / S. Konarski; z języka łacińskiego przełożyła W. Germain; przypisami zaopatrzył J. Czubek; wstępem poprzedził S. Kot. − Kraków: M. Arct, 1925. – XVI, 511 s.
8. Popławski, A. O rozporządzeniu y wydoskanalieniu edukacyi obywatelskiey / A. Popławski. − Warszawa, 1775.
9. Popławski, A. Zbior niektorych materyi politycznych / A. Poplawski. – Warszawa, 1774.


*Паступіў 18.04.2012*

## REFORM OF EDUCATION IN THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH OF THE XVIII CENTURY

***J. TARASIUK***

*This article focuses on the history of philosophical and educational thought of the Enlightenment in the Polish-Lithuanian Commonwealth. Program «Collegium Nobilium» created by Stanisław Konarski in opposition to traditional Jesuits education is discussed here. Futher the project by Antoni Popławski that became a basis for the next reform of the educational system carried out by the Commission for the National Education is analyzed. This project provided introduction of primary education for peasants. It is also shown that the conceptual basis for educational reform was Physiocratic doctrine, popular among philosophers of the Commonwealth in the Age of Enlightenment. Acceptance of ideas of Physiocrasy led to introduction of natural law theory and political economy into educational courses and replacement of traditional course of philosophy. As a result of XVIII century's reforms education became secular and was focused on the formation of civic virtues.*